Кафедра беларускай і рускай моў створана на педагагічным факультэце (цяпер факультэт пачатковай і музычнай адукацыі) ў 1988 г. Загадчыкі кафедры — кандыдаты філалагічных навук дацэнты А. С. Лаўшук (у 1988–2002 гадах і 2015–2016 гадах), Л. І. Шапавалава (2002–2011 гг.), В. М. Шаршнёва (2011–2015 гг.) і А. А. Папейка (2016–2018 гг.).

У 2013 годзе кафедра адзначыла сваё 25-годдзе. «Атмасфера ўзаемадапамогі і творчасці» — так назвала артыкул пра гісторыю стварэння і дзейнасць кафедры старшы выкладчык Т. І. Якубовіч.

# Атмасфера ўзаемадапамогі і творчасці

***Гады бягуць, імкліва ляціць час: 100-годдзе МДУ імя А.А. Куляшова, 50-годдзе педагагічнага факультэта. У незвычайна цёплыя, лагодныя ліпеньскія дні далёкага 1988 года створана кафедра беларускай і рускай моў на педагагічным факультэте, маладзейшая за яго ў 2 разы. Сёлета ёй споўнілася 25 гадоў, багатых на высокакваліфікаваных, самаадданых, таленавітых людзей, бо менавіта чалавек варты ўвагі, пашаны, клопату, і толькі чалавеку пад сілу дабіцца поспехаў, павагі калег і студэнтаў, стварыць атмасферу ўзаемадапамогі і калектывізму, навуковых пошукаў і творчасці.***

**КАФЕДРА**

Кіравалі кафедрай цудоўныя педагогі-лінгвісты, кандыдаты філалагічных навук, дацэнты: першы загадчык – А.С. Лаўшук, памяркоўны і клапатлівы, зараз дэкан факультэта, з 2002 – Л.І. Шапавалава, мудры і ініцыятыўны працалюб, з 2011 па сённяшні дзень – В.М.Саўчанка, мэтанакіраваны і перспектыўны лінгвіст.

Успамінаецца многае, бо 43 гады (вучоба і праца) у адной установе – немалы тэрмін. На філалагічным факультэце працаваць заставаліся вядомыя філолагі-аксакалы, а амаль ўсю моладзь загадчыкі кафедраў беларускай мовы М.В. Абабурка і рускай мовы П.В. Кобзеў адпраўлялі працаваць з філфака на педфак. Першы склад кафедры: беларусазнаўцы А.С. Лаўшук, М.П. Бузук, М.П. Луферава, М.І. Укружаскі, Т.І. Якубовіч, улюбёныя ў свой прадмет і працу; рускія філолагі І.А. Блахін, Н.К. Пышкала, Т.Р.Міхальчук, В.В. Урублеўская.

Дружалюбная, цёплая атмасфера на кафедры нібы кампенсавала цяжкасці, дапамагала выконваць вялікую вучэбную нагрузку. Складаліся і перапісваліся рабочыя праграмы і планы ўручную (добра, што так часта не мяняліся, як цяпер) – не кожны меў друкавальную машынку, пра камп'ютары і слыху не было. Выхаваўчыя вялікія мерапрыемствы (адкрытых зусім не было) праводзіліся толькі па ўласнай ініцыятыве куратараў, у асноўным абмяжоўваліся гутаркамі, рознымі культпаходамі, экскурсіямі.

Некаторых калег, на вялікі жаль, сёння ўжо няма з намі, але памяць пра іх – у нашых сэрцах: Н.К. Пышкала, мудры дарадчык і філолаг ад бога; І.А. Блахін, разважлівы і перакананы прафесіянал; А.Ф. Шавякова, дасведчаны філолаг і спагадлівы чалавек. Ёсць самабытныя педагогі, неабыякавыя людзі, хоць даўно на заслужаным адпачынку, але актыўныя жыццялюбы (М.П. Луферава – аптыміст, вядомы любіцель і чытальнік вершаў, В.В. Урублеўская – сціплы майстар прыгожага слова, Г.І. Барысевіч – дапытлівая, незвычайна таленавітая і чуллівая), і мы падтрымліваем з імі цесную сувязь, запрашаем на вечарыны, святочныя мерапрыемствы. Шмат гадоў методыку выкладання беларускай мовы ў пачатковай школе вёў М.І. Укружаскі. Таленавіты, творчы, духоўна багаты чалавек і адданы працы метадыст пераканаўча даводзіў студэнтам, як трэба шанаваць, берагчы родную мову, клапаціцца пра чалавека, і зараз служыць богу і людзям. На працягу некалькіх гадоў на кафедры працавалі выкладчыкі Э.А. Старалаўнікаў, незвычайна добры чалавек і зацікаўлены метадыст; І.П. Ляўшун, добрасумленны і дружалюбны педагог, кандыдаты філалагічных навук, дацэнты Т.Р. Міхальчук, Т.В.Капяйко, цудоўныя выкладчыкі і таленавітыя паэтэсы, С.Ф.Іванова, якія цяпер працуюць на іншых кафедрах універсітэта і нават за межамі Беларусі.

З намі 18 гадоў плённа працавала на кафедры старшы выкладчык Л.І. Шышакова, сапраўдны, тактоўны педагог, сардэчны і сціплы чалавек, якая сумяшчала выкладчыцкую і рэдактарскую дзейнасць і ўжо 16 гадоў з'яўляецца рэдактарам газеты "Універсітэцкі веснік". Уражвае яе адказнасць, перакананасць, здольнасць самастойна і дасканала асвоіць тэхнічнае афармленне выдання, зайздроснае ўменне падабраць, скампанаваць матэрыялы і арганізаваць работу калектыва.

Шмат на кафедры вопытных выкладчыкаў: кандыдаты філалагічных навук, дацэнты М.П.Бузук, зараз прарэктар па вучэбнай рабоце, А.С. Лаўшук, як выкладчыкі і кіраўнікі сфарміраваліся на кафедры педагагічнага факультэта, не пакідаючы працы са студэнтамі, карыстаюцца павагай і аўтарытэтам, крыху пазней прыйшла на кафедру і Г.І. Рагаўцова, якая выконвае вялікую вучэбную нагрузку, працы якой выдаюцца ў сааўтарстве з В.М.Саўчанкай. Вольга Мікалаеўна вылучалася сярод іншых выкладчыкаў яшчэ на ФСФ сваёй настойлівасцю, цягавітасцю, пунктуальнасцю, прыветнасцю, што спрыяла прафесійнаму росту на кафедры, павазе і аўтарытэту сярод студэнтаў і выкладчыкаў (вучацца ў яе нявераготнай прыроднай сіле духу і празе заўсёды імкнуцца наперад) і ў філалагічнай навуцы. З факультэта славянскай філалогіі да нас прыйшлі, умацаваўшы навуковыя дасягненні кафедры, і кандыдаты філалагічных навук, дацэнты Л.І.Шапавалава, В.Б. Сузановіч і М.У. Ладуцька, таленавітыя даследчыкі мовы і апантаныя працай людзі, вядомыя і за межамі рэспублікі. Невычэрпныя ідэі М.У. Ладуцькі (яшчэ і намеснік дэкана па вучэбнай рабоце) агульнымі сіламі членаў кафедры ўкараняюцца ў жыццё.

Пачаўшы даўно свой працоўны шлях у ВНУ, Л.І. Шапавалава, высокаэрудзіраваны філолаг, і А.А. Свірыдзенка, дастойная яе вучаніца, з'яўляюцца душой кафедры і факультэта, ініцыятарамі многіх мерапрыемстваў, у якіх з задавальненнем удзельнічаюць выкладчыкі, студэнты і настаўнікі. Нельга абысці ўвагай і грунтоўную лінгвістычную і метадычную падрыхтоўку кандыдата філалагічных навук, дацэнта А.А. Свірыдзенкі і старшага выкладчыка Д.А. Доўгаля. Іх праца ўвогуле выклікае захапленне ў студэнтаў і дзённай, і завочнай формаў навучання, якія са светлай радасцю, шчырасцю і замілаваннем дзеляцца сваімі ўражаннямі ад калектыўных поспехаў на лекцыйных, практычных занятках, ад прафесійна праведзеных кансультацый, штодзённых чалавечых зносін. Вытрымцы, разважлівасці, мяккай патрабавальнасці, уменню адстойваць асабісты светапогляд вучымся і мы ў Д.А. Доўгаля і ўдзячны лёсу, што дараваў нам магчымасць працаваць побач з такім сціплым і бязмерна таленавітым сучасным педагогам. Такой жа светлай, таленавітай зорачкай у нас блiснула і В.А. Мычкова (Ганакова), якая настолькі пасапраўднаму шчыра ўключылася ў працу калектыва, што дзіву даешся, адкуль у такой мініяцюры бяруцца фізічныя сілы, а маральны дух настолькі моцны, што паспявае ўсюды: даць трывалыя веды, вучыць аналізаваць, тварыць, пранікаць у сутнасць з'явы, адчуваць прафесійную адказнасць, быць еднымі. Маладыя выкладчыкі не такія, як мы, яны лепшыя, перадавыя, у іх многаму можна навучыцца, і сэрца цешыцца дастойнай зменай, поўніцца радасцю і крышачку смуткам...

Вялікую нагрузку па забеспячэнні паспяховай работы кафедры ўзялі на свае плечы і добрасумленна выконваюць лекары душы нашай В.А. Сідарава, прадбачлівы працаўнік і беражлівы эканаміст; І.М. Іванова, нястомны дарадчык і памочнік, адказнасць і стараннасць якіх пастаянна дапамагае ў працы ўсім, якія даўно сталі прадаўжальнікамі справы В.П. Рабцавай, І.М. Салаўёвай, Н.А. Міхайлавай і М.Л. Барысевіч, што працавалі раней, з дзён стварэння кафеды.

На кафедры праводзіцца вялікая вучэбная, навукова-метадычная, арганізацыйная работа згодна з сучаснымі патрабаваннямі да арганізацыі вучэбнага-выхаваўчага працэсу ў ВНУ, змястоўная выхаваўчая работа (Дзень беларускага пісьменства плануецца правесці ў Быхаве, яго сёлетняй сталіцы), падтрымліваецца цесная сувязь са школай і іншымі ўстановамі адукацыі вобласці і рэспублікі. А за шматбаковай дзейнасцю кафедры стаяць людзі, прафесійна падрыхтаваныя, ініцыятыўныя, неабыякавыя; усе мы розныя, і аднолькавымі быць не можам і не павінны. У кожнага сваё светаўспрыманне, сямейныя клопаты, і, стараючыся працаваць па-новаму, імкнёмся змяніць жыццё да лепшага і вучыцца беражлівасці, узаемнай падтрымцы, справядлівасці і памятаць – у чалавечнасці, у працы і ведах, а не ў званнях і пасадах сапраўдная краса чалавека.

Юбілей, хоць і ў чвэрць стагоддзя, прыемная падзея, якая дазваляе асэнсаваць пройдзены шлях, а галоўнае, па-добраму, шчыра ўспомніць тых цудоўных людзей, якія доўгія гады і зараз з намі і ў цяжкасцях, і радасцях, узгадаць былое, думаючы, што наша праца не была дарэмнай, падзякаваць усім, што вы былі, ёсць і будзеце ў жыцці...

**Т. ЯКУБОВІЧ.**